ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА



**Тры нішы для «Драздоў»**




**Як настаўніку застацца ў трэндзе**



**Што «Піранні» па зубцах?**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Аляксандр БУРЫ, генеральны дырэктар нацыянальнага парку «Белавежская пушча»:**

*«У 2017 годзе нацыянальны парк наведалі 465 тысяч турыстаў, у тым ліку каля 70 тысяч іншаземцаў. Турыстычны паток павялічваецца. Прагназую, што ў гэтым годзе ён будзе большы, чым летась, таму што за першы квартал па колькасці турыстаў мы прыраслі на 15 %. Яшчэ ўвесь год наперадзе. Мяркую, мы перасягнём лічбу ў 500 тысяч. Прыкметна вырасла актыўнасць беларускіх турыстаў. Таксама выкарыстоўваюць магчымасць наведаць Белавежскую пушчу без візы ўсё больш замежнікаў».*

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

3 МАЯ 2018 г. ЧАЦВЕР № 83 (28699)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# КРЫЛАТЫЯ АБЯРЭГІ ПАМЯЦІ



Жыхар Хойнікаў **Аляксандр ФІЛОНЧЫК** кожную вясну клапоціцца пра знешні выгляд свайго дома, фарбуе аконныя ліштвы. А ліштвы — незвычайныя і невыпадковыя — з птушкамі!

— У нашай вёсцы Дворышча, а гэта недалёка ад райцэнтра, была традыцыя рабіць дэкор над вокнамі ў выглядзе галубоў. «Галубы» былі і на нашай хаце. Зрабіў іх мой бацька — цясляр і сталяр, — успамінае Аляксандр Філончык. — Але пасля чарнобыльскай катастрофы ў 1991 годзе наша сям'я пераехала ў больш бяспечнае месца і купіла гэты дом. І, каб захаваць традыцыю, вырашылі на новым старым будынку таксама «пасяліць» крылатых ахоўнікаў.

Выпільваць і апрацоўваць драўляныя фігуркі бацька даверыў сыну. Дванаццаць птушак — па дзве на кожным акне — Аляксандр зрабіў за тры дні. І вось ужо дваццаць тры гады дом красуе сваімі вокнамі.

— Усе імкнуцца замяніць аконныя рамы на сучасныя еўрапакеты, а я не парушаю гармонію, не мяняю рамы на пластыкавыя. Захоўваю традыцыю і памяць пра дом свайго маленства, вёску і бацьку, — кажа Аляксандр Валянцінавіч.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара,**
*г. Хойнікі.*

■ Разумныя грошы

## А МОЖНА І БЯСПЛАТНА

### За што прыйдзецца раскашэліцца трымальніку карткі

**Мы ўжо шмат казалі пра перавагі банкаўскіх картак. І зручныя яны, і бяспечныя, і нават умеюць прыносіць дадатковы прыбытак. Але, як вядома, у любога медаля ёсць адваротны бок. У нашым выпадку такім бокам можна назваць платнасць, як саміх картак, так і паслуг, якія банкі аказваюць кліентам-трымальнікам.**

### Калі платная карта таннейшая

На самай справе, разнастайных камісій існуе вельмі шмат. Аднак гэта не азначае, што яны штодня будуць пераследаваць па пятах трымальніка звычайнага «пластыку». Мабыць, першыя выдаткі, з якімі можа сутыкнуцца патэнцыйны гаспадар карткі, — гэта плата за яе выпуск і абслугоўванне.

Трэба разумець, што ў шэрагу выпадкаў картка можа дастацца вам, што называецца, бязвыплатна, гэта значыць дарма. Так, напрыклад, традыцыйна бясплатна выдаюцца базавыя зарплатныя карткі. Некаторыя банкі ў рамках акцый або проста па дабрыні душэўнай прапануюць афарміць бясплатна ашчадныя карткі, звычайныя дэбетовыя ці нават крэдытныя.

Але ёсць карткі, якія каштуюць вялікіх грошай. Пры афармленні такога «пластыку» трэба разумець, за што вы плаціце, аналізаваць пакет дадатковых паслуг, якія можа быць уключаны ў кошт карткі.

СТАР. 4

■ Напярэдадні падзеі




## Шукаць варыянты, пазітыў і перамагаць

### 82-і чэмпіянат свету па хакеі стартуе заўтра ў Даніі

**Гэтая краіна ўпершыню становіцца гаспадыняй сусветнага першынства ў згаданым відзе спорту. Дарэчы, рашэнне аддаць чэмпіянат датчанам было прынята на кангрэсе Міжнароднай федэрацыі хакея ў 2014 годзе ў Мінску, тады за гэта права змагалася яшчэ і Латвія.**

СТАР. 3




ISSN 1990 - 763X
18083